**ТЫПЫ СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫХ СКАЗАЎ З НЕКАЛЬКІМІ ДАДАНЫМІ ЧАСТКАМІ,** тыпы складаназалежных сказаў ускладненай будовы, разнавіднасці складаназалежных сказаў ускладненай будовы ў залежнасці ад асаблівасцей спосабу сувязі даданых частак з галоўнай.

У лінгвістычнай літаратуры вылучаюць сказы з паслядоўным падпарадкаваннем даданых частак, сказы з сузалежным падпарадкаваннем даданых частак і сказы са змешаным падпарадкаваннем даданых частак.

Сказы з паслядоўным і сузалежным падпарадкаваннем з'яўляюцца асноўнымі структурнымі тыпамі складаназалежных сказаў ускладненай будовы. Сказы са змешаным падпарадкаваннем утвараюць камбінаваны структурны тып. У межах сказаў з сузалежным падпарадкаваннем адрозніваюць асноўныя структурныя падтыпы (сказы з сузалежным аднародным і сказы з сузалежным неаднародным падпарадкаваннем) і камбінаваны структурны падтып (сказы з разнародным падпарадкаваннем).

Мінімальная структура сказаў з паслядоўным, сузалежным аднародным і сузалежным неаднародным падпарадкаваннем уключае адну галоўную і дзве даданыя часткі, што будуюцца ў адпаведнасці з асноўнымі (базавымі) схемамі, кожная з якіх можа пашырацца праз далучэнне трэцяй і наступных даданых частак.

**Складаназалежны сказ ускладненай будовы з паслядоўным падпарадкаваннем даданых частак** – гэта разнавіднасць складаназалежнага сказа ўскладненай будовы, у якім галоўнай частцы падпарадкоўваецца даданая, якой падпарадкоўваецца іншая даданая. Даданая частка, падпарадкаваная галоўнай, называецца даданай I ступені, даданая частка, залежная ад даданай I ступені, называецца даданай II ступені і г.д.

Даданыя часткі пры паслядоўным падпарадкаванні могуць быць аднаго тыпу, (выражаць аднолькавыя семантыка-сінтаксічныя адносіны), а могуць належаць да розных тыпаў (выражаць розныя семантыка-сінтаксічныя адносіны): *Зусім на доле дарожку перабягаў невялікі ручай, які цурчэў з-пад маладой алешыны, што ўзнімалася над чаротамі* (П. Броўка); *Так ціха, што чутно ўначы, як у суседа сэрца б'ецца* (А. Астрэйка). Сродкамі сувязі даданых частак пры паслядоўным падпарадкаванні выступаюць розныя ці аднолькавыя злучнікі і злучальныя словы.

Пазіцыя ўсяго ланцужка даданых частак залежыць ад пазіцыі даданай I ступені, якая можа размяшчацца ў прэ-, інтэр- і постпазіцыі адносна галоўнай часткі. У залежнасці ад гэтага ў навуковай літаратуры адрозніваюць шэсць структурных схем складаназалежнага сказа ўскладненай будовы з паслядоўным падпарадкаваннем (Т.Я. Шэмет):

1) даданая I ступені – у постпазіцыі адносна галоўнай часткі, а даданая II ступені – у постпазіцыі адносна даданай першай ступені. Такое найбольш распаўсюджанае размяшчэнне паслядоўна звязаных даданых частак звычайна называюць прамым: *Я прыходжу сюды, каб паслухаць, як ліпы шумяць* (М. Шабовіч);

[ … ], ( I ), ( II );

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) даданая I ступені – у прэпазіцыі адносна галоўнай, а даданая II ступені – у постпазіцыі адносна даданай першай ступені: *Хто аддае ніўцы, што яна родзіць, той да суседа па хлеб не ходзіць* (Прыказка);

( I ), ( II ), [ … ];

3) даданая I ступені – у постпазіцыі да галоўнай, а даданая II ступені – у інтэрпазіцыі да даданай I ступені: *Альшанцы расказваюць, што вясной ці ўвосень, калі разгуляецца паводка, толькі верталёт мае доступ у іх далёкія, але прыгожыя мясціны* (В. Палтаран);

[ … ], ( I ,( II ), … );

4) даданая I ступені – у інтэрпазіцыі да галоўнай, а даданая II ступені – у постпазіцыі адносна даданай I ступені: *Некалі па гэтай кніжцы, дзе над кожным словам стаялі націскі, каб дзеці правільна вымаўлялі словы, хлопчык Ігнась вучыўся чытаць па-беларуску, завучваў на памяць беларускія вершы* (Л. Арабей);

[… , ( I ), ( II ), …];

5) даданая I ступені – у інтэрпазіцыі да галоўнай, а даданая II ступені – у інтэрпазіцыі да даданай першай ступені: *Але тое, што адчуваеш на Шыпцы, дзе навечна ўсталі побач, ідучы супраць страшнай навалы, рускі салдат з балгарскім апалчэнцам, або ў Плевене, у яго мемарыяльных маўзалеях, – гэтае пачуццё не параўнаеш ні з чым у свеце* (К. Кірэенка);

[… ,( I ,( II ), …), …];

6) даданая I ступені – у прэпазіцыі да галоўнай, а даданая II ступені – у інтэрпазіцыі да даданай I ступені: *І калі б у анкетах, якіх мы так шмат запаўняем, была графа “вашы любімыя гарады”, я абавязкова ўпісаў бы яго туды* (А. Кудравец);

( I , ( II ), …), [ … ]

Большасць структурных схем складаназалежнага сказа ўскладненай будовы з паслядоўным падпарадкаваннем даданых частак адносіцца да малапрадуктыўных ці непрадуктыўных. Толькі першая структурная схема лёгка пашыраецца даданымі III, IV і іншых ступеней: *Лічу, што прапала тое лета, калі я не пабываю дома ў час касавіцы, не папрацую на лузе, не паслухаю песню касцоў, што вяртаюцца ўвечары дадому* (Д. Бічэль-Загнетава).

**Складаназалежны сказ ускладненай будовы з сузалежным падпарадкаваннем даданых частак** – гэта разнавіднасць складаназалежнага сказа ўскладненай будовы, у якім усе даданыя часткі падпарадкаваны галоўнай: *Журба гэтая ішла не толькі ад таго, што поле галела, што ў ім адчуваўся нядобры, пагібельны подых недалёкай восені* (І. Мележ).

У навуковай і лінгваметадычнай літаратуры (Т.Р. Рамза, Т.Я. Шэмет, М.С. Яўневіч) адзначаецца, што такія канструкцыі маюць дзве разнавіднасці – складаназалежныя сказы ўскладненай будовы з сузалежным аднародным падпарадкаваннем даданых частак і складаназалежныя сказы ўскладненай будовы з сузалежным неаднародным падпарадкаваннем даданых частак, напрыклад: *І не кажы мне, што турбот не трэба, што шлях мой хтосьці паўторыць на зямлі…* (М. Шабовіч); *Потым бадзёры марозік, якім вельмі*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*яршыста дыхаецца, падмарозіць поле, дзе прыгожа зелянее азіміна, вуліцу* (Я. Сіпакоў). У сказах з 3-ма і больш часткамі сустракаецца спалучэнне сузалежнага аднароднага і сузалежнага неаднароднага падпарадкавання: *І лёгка стане на душы, калі аціхне завіруха, што выжыў, што не саграшыў, што нават сэрца не паслухаў…* (М. Шабовіч). Такія канструкцыі называюцца *складаназалежныя сказы ўскладненай будовы з сузалежным разнародным падпарадкаваннем даданых частак*.

***Складаназалежны сказ ускладненай будовы з сузалежным аднародным падпарадкаваннем даданых частак*** – гэта разнавіднасць складаназалежнага сказа ўскладненай будовы, у якім усе даданыя часткі, падпарадкаваныя аднаму апорнаму элементу галоўнай, выражаюць аднолькавыя семантыка-сінтаксічныя адносіны. Сродкамі сувязі частак такіх сказаў могуць выступаць аднолькавыя ці розныя злучнікі і злучальныя словы. У залежнасці ад гэтага сярод складаназалежных сказаў ускладненай будовы з сузалежным аднародным падпарадкаваннем адрозніваюць сказы з аднолькавымі злучнікамі (злучальнымі словамі) і сказы з рознымі злучнікамі (злучальнымі словамі): *Ён* [Хведар] *раптам спыніўся, уражаны тым, што, як жывую, пачуў пад нагамі пакрытую слабенькім мохам і ігліцаю зямлю, што гэтак чыста і свежа, як у маладосці, абноўлена чуе жыццё і радуецца яму* (А. Жук); *Ён* [Зыгмусь] *вельмі любіў блукаць па бярозавым узлеску, дзе на купінах між блакітнага верасу чырванелі сакавітыя брусніцы і адкуль часта ўзляталі ўгару чароды цецерукоў* (В. Дайліда).

Аднародныя даданыя часткі могуць звязвацца паміж сабой злучнікавай (злучальнай) і бяззлучнікавай сувяззю: *Хачу пабачыць, як лісты пазалацяць мае бярозы* ***і*** *ў лесе пількаўскім густым майго дажджу пральюцца слёзы…* (М. Шабовіч); *У ліпені, жніўні, калі шумелі цёплыя дажджы,* ***а*** *ўночы ападалі туманы* ***і*** *зямля проста-такі набухала вільгаццю, з ранку да вечара мы прападалі ў лесе* (М. Шыманскі); *Пад дубамі мы, вясковыя хлапчукі, як толькі мінала доўгая халодная зіма, раставаў снег, зелянеў поплаў, пасвілі свіней, раскладвалі вогнішчы, пяклі пячонікі, ляжалі ў цяньку, уставіўшыся вачыма ў бяскрайні блакіт неба, думаючы, марачы кожны пра сваё* (Б. Сачанка).

У навуковай літаратуры (Т.Я. Шэмет) адрозніваюць тры базавыя структурныя схемы складаназалежных сказаў ускладненай будовы з сузалежным аднародным падпарадкаваннем, што абумоўлена сумежнасцю даданых частак:

1) аднародныя даданыя часткі – у постпазіцыі адносна галоўнай: *Асабліва прыгожай бывае палеская пушча ў ціхія марозныя дні, калі па-святочнаму ўбраны ў белае лес стаіць застылы ў нерухомасці і на кожным дрэве, на кожнай галінцы дыяментамі іскрацца, пераліваюцца асветленыя сонцам блёсткі снегу* (У. Краўчанка);

[…], (…), (…);

2) аднародныя даданыя часткі – у інтэрпазіцыі адносна галоўнай*: І заўсёды, калі паднімаўся над сасной ясны марозны маладзік або неслася над ёй хмара, нешта не то рыпела ў ёй, не то надрыўна кашляла* (В. Іпатава);

[… ,(…), (…), …];

3) аднародныя даданыя часткі – у прэпазіцыі адносна галоўнай: *Калі грыміць, калі б'юць перуны, ведаў і я, не будзь пад дрэвам* (Ф. Янкоўскі);

(…), (…), […].

Усе тры базавыя структурныя схемы могуць пашырацца за кошт трэцяй і наступных частак: *Напэўна б, са светам расстаўся лягчэй, каб тых не прыпомніў кастроў і начэй, каб дзічкі вясной на мяжы не цвілі, каб песень купальскіх ні чуў аніколі, каб жытам не пахла асенняе поле, каб так не любіў беларускай зямлі* (С. Грахоўскі); *Мясціна, дзе я нарадзіўся, дзе ўслед за маці сказаў першае слова, дзе вучыўся ў школе, садзіў дрэўцы ў садзе, – гэта вёска Гайшын на Магілёўшчыне* (К. Кірэенка); *Ці пакрыецца неба хмарамі, ці затмее зарою ўсход, ці глядзіць да дня ноч пажарамі на раку, на высокі чарот, – ўсё старэнькая маці моліцца за дзяцей, партызанаў сваіх…* (М. Танк).

Некаторыя сінтаксісты (М.С. Яўневіч), прымаючы пад увагу прыроду апорнага элемента (раз апорныя элементы – аднародныя члены сказа, значыць і спосаб сувязі – сузалежнае аднароднае падпарадкаванне), да складаназалежных сказаў ускладненай будовы з сузалежным аднародным падпарадкаваннем адносяць канструкцыі, даданыя часткі якіх залежаць ад аднародных членаў галоўнай часткі: *І людзі, што пшаніцу, жыта сеюць, і сонца, што палеткі саграе, і дождж, і вецер, што над полем вее, і аграном, што рана ўстае, і хлебапёк, і нават прадаўшчыца, камбайны, элеватары, млыны, і грузавік, што пад дажджом імчыцца, – ствараюць хлеб для нас усе яны* (М. Танк). У такіх сказах рэалізуецца другая базавая структурная схема: даданыя часткі ў інтэрпазіцыі да галоўнай.

***Складаназалежны сказ ускладненай будовы з сузалежным неаднародным падпарадкаваннем даданых частак*** – гэта разнавіднасць складаназалежнага сказа ўскладненай будовы, у якім 1) даданыя часткі падпарадкаваны аднаму апорнаму элементу галоўнай, але выражаюць розныя семантыка-сінтаксічныя адносіны, 2) даданыя часткі залежаць ад розных апорных элементаў галоўнай і выражаюць розныя семантыка-сінтаксічныя адносіны, 3) даданыя часткі залежаць ад розных апорных элементаў галоўнай і выражаюць аднолькавыя семантыка-сінтаксічныя адносіны. У залежнасці ад гэтага вылучаюцца:

1. Сказы з прыадначленнымі рознафункцыянальнымі даданымі: *Я павярнуўся, каб ісці дамоў, як з сінічніка зноў пачулася лопанне крылаў* (Р. Ігнаценка).

2. Сказы з прыразначленнымі рознафункцыянальнымі даданымі: *Як толькі сцямнела, мы далучыліся да грамада дзяўчат, жанок і падлеткаў, што накіроўваліся на выган* (А. Ліс).

3. Сказы з прыразначленнымі аднафункцыянальнымі даданымі: *Бойкі конік, што дружнаю рыссю зараз жа выскачыў з-пад навіслых ялін на прасторную палянку, борзда імчаў лёгкія прыгожыя сані, у якіх звычайна ездзіць заможная шляхта або сярэдняй рукі панкі* (Я. Колас).

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Сродкамі сувязі ў такіх канструкцыях выступаюць розныя злучнікі і злучальныя словы.

Паколькі дададныя часткі могуць размяшчацца ў прэ-, інтэр- і постпазіцыі адносна галоўнай, адрозніваюць шэсць базавых структурных схем для складаназалежных сказаў ускладненай будовы з сузалежным неаднародным падпарадкаваннем дададных частак:

1) адна дададная частка – у прэпазіцыі адносна галоўнай, а другая дададная частка – у постпазіцыі адносна галоўнай: *Пакуль яшчэ куе мая зяюля, не дакарай, што не пазбыўся страт* (М. Шабовіч);

(…), […], (…);

2) адна дададная частка – у прэпазіцыі адносна галоўнай, а другая дададная частка – у інтэрпазіцыі адносна галоўнай*: Калі лось глянуў на неба, у тым баку, дзе вісеў над ракой мост, грымнула нешта на ўсю моц…* (І. Чыгрынаў);

(…), […, (…), …];

3) адна дададная частка – у інтэрпазіцыі адносна галоўнай, а другая дададная частка – у постпазіцыі адносна галоўнай: *Чарадзея, які сышоў са старонак “Спадчыны”, “Адвечнай песні”, “Раскіданага гнязда” і “Паўлінкі”, я ўбачыў ужо ў сталыя гады, калі прыехаў у Мінск* (В. Вітка);

[…, (…), …], (…);

4) дададныя часткі – у постпазіцыі адносна галоўнай: *Бядулю пазнаў, як толькі ўбачыў, хоць да сустрэчы не ўяўляў такім* (С.Грахоўскі);

[…], (…), (…);

5) дададныя часткі – у прэпазіцыі адносна галоўнай: *Хаця не ўсе былі згодны з рашэннем начальніка цэха, хто перавыконвае план, той атрымлівае надбаўку*;

(…), (…), […];

6) дададныя часткі – у інтэрпазіцыі адносна галоўнай*: Яны* [журавы] *спакойна, не спяшаючыся, махалі ў воблаках крыллем, на якое, здавалася, як павуціна, наматваліся хмары, махалі, нібы развітваючыся з усім, што бачылі зверху, і неяк задумліва, нават крыху сумнавата, трубілі* (Я. Сіпакоў);

[…,(…), … ,(…), …].

Асобныя мовазнаўцы (Т.Я. Шэмет), улічваючы разнастайнасць структуры такіх канструкцый, да складаназалежных сказаў ускладненай будовы з сузалежным неаднародным падпарадкаваннем адносяць сказы, дададныя часткі якіх залежаць ад аднародных членаў галоўнай. Пры такім падыходзе ў канструкцыях можа рэалізавацца трэцяя ці шостая базавыя структурныя схемы (першая дададная частка – у інтэрпазіцыі, другая дададная частка – у постпазіцыі або першая і другая (і наступныя) часткі – у інтэрпазіцыі): *Пільна ўглядаўся* [Арсень] *у хату, у садок, у якім ведаў кожную яблыню і вішню, у вербы, што так пышна разрасліся над сажалкай* (Т. Хадкевіч); *Толькі перад зярном, што прагне каласіцца, перад жалезам, што жыць на зямлі памагае, перад калясом, што развозіць песні і гасцінцы, перад іголкай, што мяхі ў дружбу сшывае, перад дарогай, што вядзе да сонца, перад птушкай, што помніць дрэвы свайго гаю, перад вадой, што не*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*замярзае ў палонцы, перад чалавекам, што праўды шукае, – будучыня* (М. Танк).

***Складаназалежны сказ ускладненай будовы з сузалежным разнародным падпарадкаваннем даданых частак*** – гэта разнавіднасць складаназалежнага сказа ўскладненай будовы, для структуры якога характэрна спалучэнне аднародных і неаднародных даданых частак: *Прыплюшчыўшы вочы, Каляда глядзеў у поле, на трактар, за якім плавала сухое воблачка пылу, слухаў, як гудуць ад стомленасці ногі, як моцна стукае сэрца і як стамілася ўсё ягонае цела* (А. Жук). Калі складаназалежны сказ ускладненай будовы з сузалежным разнародным падпарадкаваннем уключае тры даданыя часткі, то аднароднымі могуць быць першая і другая або другая і трэцяя даданыя часткі: *Хоць ты і далёка, хоць вестак не чую, бываюць часіны, калі я сумую* (А. Астрэйка); *Калі, здарожаны тугой, сюды вяртаюся раз-пораз і бачу зноў жытнёвы колас, лес пад вясёлкавай дугой, – я пачынаю разумець, чаму так цёпла на радзіме, чаму, ад'ехаўшыся ледзь, імчыш да вёскі, да адзінай* (М. Шабовіч).

Пры сузалежным разнародным падпарадкаванні даданыя часткі размяркоўваюцца ў межах вузлоў падпарадкавання. Пад вузлом падпарадкавання разумеюць пэўны член галоўнай часткі, ад якога залежаць адна даданая частка ці некалькі аднародных даданых частак: *Толькі чалавек, які вельмі добра ведае мясцовасць, стоячы на пагорку сярод разлеглага шэрага ржышча, мог разгадаць, дзе ўзвышаліся калісьці дубы, цягнуліся купы лазняку, грады алешніку, дзе, нарэшце, стаялі хаты хутаранцаў* (І. Навуменка). Сузалежныя неаднародныя даданыя часткі, а таксама тыя, што падпарадкаваны розным членам сказа, утвараюць розныя вузлы падпарадкавання: *Чым далей ужываемся ў горад, чым большая робіцца наша любоў да яго, тым часцей трывожыць нейкі незразумелы сум, у якім цяжка бывае разабрацца самому, сум па вузкай сцяжынцы ў жыце, вогнішчы на бульбянішчы, па невялічкай копцы сена, у якой стомленаму дужа добра спіцца* (Я. Сіпакоў). Пашырэнне сказаў з сузалежным разнародным падпарадкаваннем адбываецца за кошт павелічэння колькасці аднародных даданых частак у адным з вузлоў падпарадкавання, а таксама за кошт павелічэння колькасці саміх вузлоў. Аднародныя даданыя часткі могуць быць адначасова ў розных вузлах падпарадкавання: *Там, дзе хвалямі лашчыцца Нарач, дзе на небе – ні хмары-хмурынкі, ёсць дзяўчынка, што клічуць Марынка, аб якой мае даўнія мары* (М. Шабовіч).

**Складаназалежны сказ ускладненай будовы са змешаным падпарадкаваннем даданых частак** – гэта разнавіднасць складаназалежнага сказа ўскладненай будовы, для структуры якога характэрна спалучэнне адначасова сузалежнага і паслядоўнага падпарадкавання даданых частак: *Уранку лугі заўсёды высцілаў густы туман, па якім, здавалася, можна было бегчы, як па палатне, і які сведчыў ужо, што ў прыродзе пачынаецца дужанне цеплыні і холаду* (Я. Сіпакоў). У такіх сказах вылучаюцца не менш за дзве ступені падпарадкавання даданых частак. Даданыя часткі, якія залежаць ад галоўнай, размяшчаюцца на першай ступені, даданыя часткі, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

залежаць ад даданага першай ступені, размяшчаюцца на другой ступені і г.д.: *Па сцежачцы, што, віляючы між дрэў, шылася ў гушчар, туды, дзе чарнеў голы алешнік, было балотца, кладкі, я мінуў малады хвайнячок, які парос на рэдкалессі* (Б. Сачанка). Калі ў структуры складаназалежнага сказа ўскладненай будовы тры даданыя часткі, то яны размяшчаюцца на дзвюх ступенях падпарадкавання і звязваюцца з галоўнай і паміж сабой у выніку спалучэння паслядоўнага і сузалежнага аднароднага падпарадкавання або паслядоўнага і сузалежнага неаднароднага падпарадкавання: *І якой радасцю свяціліся вочы Верасоўскага, калі ў поле змроку раптам трапляліся высокія бабкі нажатага жыта ці крыжыкі залацістага, толькі што павязанага ў снапы ячменю, калі раптам дзе ў вёсцы чуў руплівы і задумлівы стук тапара і потым бачыў самога чалавека, які на папялішчы рубіў сабе хату* (Я. Сіпакоў); *На другі дзень раніцай, калі промні сонца не паспелі запаліць буйныя кроплі расы, нават не пафарбавалі чырвоным верхавіны самых высокіх дубоў, Бялькевіч узяў эцюднік і, ціха ступаючы, каб не разбудзіць сябра, скіраваў на тую палянку, якую аблюбаваў яшчэ ўчора* (Л. Гаўрылкін).

Тры даданыя часткі могуць размяркоўвацца ў такіх канструкцыях двума спосабамі: 1) на першай ступені дзве часткі, на другой ступені – адна частка, 2) на першай І ступені – адна частка, на другой ступені – дзве часткі, напрыклад: 1) *Вучыў мяне лес пазнаваць прыгоства, суладнасць і чары прыроды, дзе птаства спраўляе штогод карагоды, дзе тояць крыніцы празрыстыя воды для рэчак, каб край умываць* (Я. Колас). 2) *Перад яго* [Максіма] *вачыма ажывалі ў новай красе далёкія вобразы, якія заставаліся да канца неспазнаныя на той зямлі, дзе ляжала яго маці, дзе лёс рана прымусіў спазнаць сірочую долю* (А. Бачыла).

Пашырэнне канструкцыі ў межах двухступеннага падпарадкавання можа адбывацца праз павелічэнне колькасці даданых частак на першай ступені; праз павелічэнне колькасці даданых частак на другой ступені і праз павелічэнне колькасці даданых частак на дзвюх ступенях адначасова. Напрыклад:

***на першай ступені***: *Цягнік імчыць з поўначы на поўдзень, з краю ўзгоркаў, курганоў, асмужаных пералескаў на вялікую раўніну, дзе лясы большыя, дзе цячэ спакойная Прыпяць, дзе хмурнай елкі амаль не ўбачыш, затое натрапіш яшчэ на дубовыя гаі, што стаяць у дваццатым веку, нібы сведкі сівой мінуўшчыны* (І. Навуменка);

***на другой ступені***: *Быў той слаўны вечар, якія бываюць у пачатку жніўня, калі яшчэ цёпла, калі нават ноччу не адчуваеш яшчэ восеньскай стыні, калі на бярозах яшчэ рэдка-рэдка патрапіш на жоўты лісток* (М. Лынькоў):

***на дзвюх ступенях адначасова***: *Усе ішлі берагам, ціха ахалі, дзівячыся на дрэвы, што глядзелі на водную роўнядзь, якая часамі пачынала стракацець кругамі, хацелі разгледзець, дзе нарэшце скончыцца гэты роўны прасцяг і пачнецца закругленне, за якім бераг пачне крута забіраць улева і сыдзецца з тым месцам, з якога яны выйшлі* (У. Дамашэвіч)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ